# З залы чакання — на п'едэстал

Юныя артысты студыі "Кляксы" заваявалі гран-пры VII Міжнароднага танцавальнага праекта Dream Dance Fest, які праходзіў у межах "Славянскага базару ў Віцебску". За сцэнічным трыумфам — 20 гадоў нястомнай працы, пошуку і адданасці справе.





"Кляксы" распачалі дзейнасць у 2005-м на базе Палаца культуры Мінскага трактарнага завода. Заснавальнікам і мастацкім кіраўніком стала Яўгенія Рэзнікава — выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Дзіцячая мара Яўгеніі Ігараўны аб уласнай студыі ператварылася ў рэальнасць адразу пасля вучобы — і гэта быў зыходны пункт вялікага шляху. Ужо праз некалькі гадоў калектыў заявіў пра сябе як пра самабытны і прафесійны, а ў 2013-м атрымаў ганаровае званне ўзорнага.

Першапачаткова ў студыі праводзіліся заняткі па вакале, выяўленчым мастацтве, але пазней танец стаў цэнтральным напрамкам. Сёння "Кляксы" спецыялізуюцца на эстраднай і сучаснай харэаграфіі, а таксама вывучаюць асновы класічнага танца, K-pop і вулічныя стылі.

— Мы заўсёды адкрыты інтарэсам дзяцей, — падкрэслівае Яўгенія Ігараўна. — Калі з'яўляецца цікавасць да новага кірунку, шукаем адпаведнага педагога. Галоўнае — каб дзіця натхнялася і развівалася.

## ПРАСТОРА ВЫХАВАННЯ

У "Кляксах" — хлопчыкі і дзяўчынкі ад трох гадоў, многія застаюцца тут нават пасля 18. Прытым важна, каб заняткі ўспрымаліся не як забава, а як сур'ёзная творчая дзейнасць.

Пры паступленні пачаткоўцы праходзяць прагляд. Гэтае слова ў калектыве мае асаблівае значэнне: педагогі не ацэньваюць, а назіраюць — за музычнасцю, пачуццём рытму, пластыкай. У выніку фарміруюцца групы — базавая або прасунутая.

Філасофія студыі грунтуецца на перакананні, што танец — не толькі мастацтва руху, але і інструмент выхавання. Асноўны акцэнт — на калектыўнай працы, узаемнай павазе і адказнасці. Тут развіваюць дысцыпліну, вучаць культуры камунікацыі і арганізоўваюць прастору, дзе кожны адчувае сябе часткай творчай супольнасці. "Кляксы" прынцыпова адмаўляюцца ад дарослай сцэнічнай эстэтыкі ў дзіцячых пастаноўках. У калектыве няма гламурных вобразаў — нумары адпавядаюць узросту ўдзельнікаў як па форме, так і па сэнсе. Галоўнае — натуральнасць, шчырасць і эмацыйная праўдзівасць.

Ідэі для пастановак нараджаюцца па-рознаму — ад музычнага настрою, размовы з юнымі артыстамі, унутранага імпульсу. Важны крытэрый — актуальнасць. Выхаванцы самі прапануюць тэмы, якія іх хвалююць: сяброўства, адзінота, школьныя перажыванні. Такім чынам, сцэна становіцца люстэркам дзіцячага свету.

У студыі працуе сем харэографаў, сярод іх — дзве былыя ўдзельніцы "Кляксаў", якія вярнуліся ў калектыў у якасці педагогаў. Некаторыя выпускнікі працягваюць адукацыю ў галіне харэаграфіі, а пасля перадаюць вопыт малодшым як настаўнікі.

## ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

Студыя ўжо ў чацвёрты раз удзельнічала ў Dream Dance Fest, але менавіта сёлета здолела здзівіць журы і заваяваць гран-пры. Раней калектыў паспяхова пераадольваў адборачныя туры, аднак фінальныя ўзнагароды заставаліся недасягальнымі. У 2025-м усё змянілася: нумар "Зала чакання" прызнаны найлепшым.

— Мы былі шчыра ўражаны, — гаворыць Яўгенія Рэзнікава. — Менавіта гэтая дзіцячая група спрабавала прайсці адбор цягам чатырох гадоў. Далей прапускалі іншыя нашы нумары, а гэтым выхаванцам не шанцавала тры сезоны запар: ніколі не траплялі нават у лік прызёраў. І раптам — гран-пры. Нечакана, але неверагодна радасна.

Пастаноўка ператварае сцэну ў вакзальную залу, дзе сустракаюцца розныя тыпажы — ад сем'яў, якія спазніліся, да зладзеяў. Гэта не проста танец, а міні-спектакль з выразнай драматургіяй, музыкай і жывымі эмоцыямі. Нумар стаў мастацкай візітоўкай студыі, здолеўшы перадаць гісторыю праз рух.

Асноўны прынцып "Кляксаў" — індывідуальны падыход.

Тут не шукаюць "ідэальных" танцораў: выступаюць дзеці ў акулярах, нестандартнай знешнасці, рознай камплекцыі. Кожны атрымлівае ролю, якая падкрэслівае яго ўнікальнасць, робячы асаблівасці яркімі акцэнтамі.

— Не хаваем індывідуальнасць, а ўздымаем яе на сцэну, — адзначае кіраўнік. — Хтосьці становіцца бабуляй, хтосьці — хуліганам. Гэта тэатр танца, дзе важныя ўсе.

## ВЫГАДАВАЦЬ ЧАЛАВЕКА

"Кляксы" — калектыў, які жыве выступленнямі. На працягу навучальнага года студыя актыўна ўдзельнічае ў дзясятках фестываляў і конкурсаў — як у Беларусі, так і за яе межамі. Юных артыстаў можна ўбачыць на буйных культурных падзеях: "Талент краіны", "Славянскі базар у Віцебску", "Музычныя вечары ў Мірскім замку", а таксама на дзяржаўных мерапрыемствах у Палацы Рэспублікі, Палацы спорту і на "Мінск-арэне".

Пасля знакавай перамогі калектыў атрымаў у Віцебску яшчэ адну ўзнагароду — гран-пры фестывалю "Агонь маладзевых талентаў". Наперадзе новыя сцэнічныя выклікі і падрыхтоўка да наступнага Dream Dance Fest — конкурсу, які стаў для студыі пунктам творчага росту.

— Мы на "Славянскім базары ў Віцебску" не дзеля медалёў, а дзеля асаблівай атмасферы, — падкрэслівае Яўгенія Рэзнікава. — Гэта месца, дзе нараджаецца натхненне. Выдатная арганізацыя, напружанасць эмоцый, хваляванне — усё на вышыні. Кожны год я прыязджаю з дрыжыкамі ў каленях.

У эпоху, калі форма часта дамінуе над зместам, калектыў застаецца прыкладам таго, як танец можа быць адначасова і мастацтвам, і сродкам выхавання, і філасофіяй. У студыі вучаць не толькі прыгожа рухацца, але і думаць, адчуваць, паважаць сябе і іншых.

20 гадоў таму ўсё пачалося з дзіцячай мары. Сёння "Кляксы" — цэлая сістэма каштоўнасцей, праца сотняў дзяцей і педагогаў, перамогі і складаныя этапы. І, галоўнае, гэта шчырая вера ў тое, што праз творчасць можна выхаваць шчаслівага чалавека.

**Ганна КАЛІНІНА**

Фота з архіва калектыву